УДК 39 (=161.3)(06)

# МІЖВАЕННАЕ ПАКАЛЕННЕ БЕЛАРУСКІХ ЭТНОГРАФАЎ: МАІСЕЙ ГРЫНБЛАТ VS МАР'ЯН ПЕЦЮКЕВІЧ

*канд. гіст. навук, дац. С.А. ЗАХАРКЕВІЧ*
**Беларускі дзяржаўны ўніверстітэт, Мінск**

*Дадзена спроба правесці агульны аналіз пакалення міжваенных этнографаў Беларусі на прыкладзе параўнання біяграфій М. Пецюкевіч і М. Грынблата. Яны былі сучаснікамі найбуйнейшых гістарычных падзей XX ст., звязаных з Беларуссю, што аказала ўплыў на фарміраванне ў іх падобнай карціны свету. Абодва былі захопленыя вывучэннем культуры беларускага народа, аднак, у канчатковым выніку, не здолелі цалкам рэалізаваць свой навуковы патэнцыял.*

Гісторыя станаўлення і развіцця беларускай этналогіі ў міжваенны перыяд нагадвае "дыскурс дасягненняў": зрабілі тое і тое, напісалі тое і тое, арганізавалі тое і тое.

Для больш глыбокага разумення гісторыі беларускай этналогіі падаецца эфектыўным вывучэнне гісторыі пакаленняў этнографаў, якія і стваралі айчынную навуку.

Пакаленне разумеецца як сукупнасць усіх людзей, якія нарадзіліся ў прамежак часу, складаючы прыкладна 20 гадоў, ці адну фазу жыцця: дзяцінства, маладосць, сярэдні ўзрост і старасць. Пакаленне магчыма ідэнтыфікаваць калі яно адпавядае тром крытэрыям. Па-першае, прадстаўнікі аднаго пакалення падзяляюць адну гістарычную эпоху: яны сутыкаюцца з аднолькавымі ключавымі гістарычнымі падзеямі і сацыяльнымі павевамі, знаходзячыся на тых самых жыццёвых фазах. Па-другое, яны падзяляюць пэўныя агульныя перакананні і мадэлі паводзінаў. Па-трэцяе, ведаючы пра вопыт і асаблівасці, якія яны падзяляюць са сваімі аднагодкамі, прадстаўнікі аднаго пакалення таксама будуць падзяляць і пачуццё прыналежнасці да дадзенага пакалення [1, с. 58].

Зыходзячы з гэтага вызначэння можна вылучыць некалькі пакаленняў беларускіх этнографаў, аб'яднаных вышэй азначанымі крытэрыямі і ўмоўна названых наступным чынам: народніцкае (М.А. Янчук, А.К. Сержпутоўскі, І.А. Сербаў, У.М. Дабравольскі, Е.Р. Раманаў і інш.), рэвалюцыйнае нацыянальна-арыентаванае пакаленне (А.А. Шлюбскі, М.В. Мялешка, М. Каспяровіч), пострэвалюцыйнае пакаленне (М.Я. Грынблат, М. Улашчык, М. Пецюкевіч) і інш.

Для разумення працэсаў развіцця беларускай этнаграфіі вельмі прывабным падаецца даць агульную характарыстыку гэтым пакаленнням этнографаў. Гэта можа даць дадатковыя падставы для больш асэнсаванага погляду на то, чаму і як адбываўся гэты працэс. Як слушна і трапна зафіксаваў англа-расійскі сацыёлаг Тэадор Шанін, "…гісторыя пакаленняў дазваляе зразумець карціну свету, якая натхняла людзей на дзейнасць крыху больш тонка, чым палітычныя і эканамічныя абставіны" [2, с. 8].

Адным з самых недастаткова вывучаных перыядаў у гісторыі беларускай этнаграфіі і этналогіі з'яўляецца міжваенны перыяд. Гэтая асіметрыя абумоўлена шматлікімі прычынамі, асэнсаванне якіх не з'яўляецца мэтай гэтага артыкула. Выкарыстанне сацыялагічнай тэорыі пакаленняў у дачыненні да гэтага перыяду развіцця беларускай этнаграфіі і этналогіі, на наш погляд, дасць магчымасць адлюстраваць яго новыя старонкі і грані.

Паспрабуем параўнаць жыццёвыя шляхі прадстаўнікоў пострэвалюцыйнага пакалення – Мар'яна Пецюкевіча і Маісея Грынблата. Яны пражылі амаль аднолькавы час – 80 гадоў: Маісей Якаўлевіч Грынблат нарадзіўся 29 сакавіка 1905 – памёр 4 ліпеня 1983, а Мар'ян Язэпавіч Пяцюкевіч нарадзіўся 24 верасня 1904, памёр 13 верасня 1983. Абдва перажылі і ўдзельнічалі на адной тэрыторыі ў аднолькавых гістарычных падзеях: Першая сусветная вайна, Грамадзянская вайна, падзел і аб'яднанне Беларусі, Другая сусветная вайна. На думку сацыёлагаў гэтае пакаленне безумоўна верыла ў светлую будучыню, адрознівалася зайздроснай працавітасцю і высокай адказнасцю, прызнавала каштоўнасці сям'і, мела дамінантнасць і катэгарычнасць меркаванняў, было непапраўнымі аптымістамі, якія свята верылі ў ідэалы [3].

**Асабістае жыццё**. М. Грынблат быў гараджанінам, мінчуком, а М. Пецюкевіч – вясковым жыхаром (з в. Цяцеркі Браслаўскага павета). Аднак і адзін і другі былі дзецьмі "пагранічча": яўрэй Грынблат быў заўсёды на пагранiччы культур, а беларус Пецюкевіч нарадзіўся і вырас у кантактнай зоне беларусаў (праваслаўных і каталікоў), старавераў, літоўцаў і палякаў, а большасць жыцця правёў ці ў польскім ці ў рускім асяроддзі.

Нараджэнне ці сталенне чалавека ў розных часцінах Беларусі адразу праграмавала калі не ўсё жыццё, то асноўныя моманты. М. Пецюкевіч нарадзіўся ў той частцы Беларусі, якая пасля Рыжскай мірнай дамовы ўвайшла ў склад ІІ Рэчы Паспалітай. М. Грынблат нарадзіўся ў Мінску, які пасля 1921 г. стаў сталіцай БССР. Гэтыя геапалітычныя абставіны моцна паўплывалі як на іх асабісты лёс, так і на гісторыю жыцця ўсіх беларусаў.

Абодва былі нацыянальна-арыентаванымі людзьмі. М. Грынблат быў у юнацтве акцёрам Вандроўнага тэатра У. Галубка, выконваў ролі ў беларускіх п’есах; у анкеце пры паступленні ў БДУ запісаўся беларусам і вызначыў роднай мовай беларускую, запаўняў анкету на беларускай мове. Захапленне беларускім тэатрам, а потым і ўвогуле беларускай культурай аказалі ўплыў на выбар этнаграфіі, як прафесійнай дзейнасці. М. Пецюкевіч быў моцна заангажаваны ў беларускі нацыянальны рух у II Рэчы Паспалітай, нават лічыўся там неблаганадзейным; працаваў у віленскай беларускай газеце “Беларуская крыніца”, быў рэдактарам часопіса “Шлях моладзі”, супрацоўнічаў з Беларускім навуковым таварыствам, Беларускім музеям ім. Івана Луцкевіча.

Адзін і другі мелі добрыя сем’і: М. Грынблат у пачатку 1930-х ажаніўся, меў сына і дачку; М. Пецюкевіч ажаніўся прыкладна ў гэты ж час, меў дзвюх дачок.

**Адукацыя**. Абодва разумелі ролю адукацыі, жадалі і імкнуліся атрымаць як мага лепшую. М. Пецюкевіч не пагадзіўся з рэкамендацыямі бацькоў стаць ксяндзом ці адвакатам, лёгка і асэнсавана для сябе змяніў выбраную спецыялізацыю з гісторыі на этнаграфію [4, с. 4–5]. Вучыўся ў адным з лепшых універсітэтаў Рэчы Паспалітай. М. Грынблат паступіў на этнолага-лінгвістычнае аддзяленне БДУ, але перайшоў на этналагічнае аддзяленне Ленінградскага ўніверсітэта, калі зразумеў, што ў БДУ веды аб этнаграфіі не атрымае.

Адзін і другі вучыліся ў лепшых навукоўцаў (дарэчы, з еўрапейскай вядомасцю). М. Грынблату выкладалі ў Ленінградскім універсітэце найлепшыя расійскія даследчыкі-этнографы Л. Штэрнберг, У. Багараз. Яго навуковым кіраўніком быў Дзмітрый Зяленін. М. Пецюкевічу выкладала Цэзарыя Будуэн дэ Куртэнэ Эрэнкройцавая і Казімір Машыньскі. Дарэчы, абодва захавалі павагу да настаўнікаў праз усё жыццё. У адным з першых уласных артыкулаў М. Грынблат нават падзякаваў прафесару Д.К. Зяленіну “за каштоўныя парады і паказаньні пры ўкладаньні гэтай працы” [5, с. 128]. М. Пецюкевіч напісаў для юбілейнага зборніка ў гонар К. Машынскага артыкул аб ім [6].

Настаўнікі прывілі абодвум ідэю аб неабходнасці “палявой” этнаграфічнай працы. Дыпломная аднаго і магістэрская другога напісаныя на ўласным шматгадовым палявым этнаграфічным матэрыяле. Да канца жыцця і М. Грынблат і М. Пецюкевіч актыўна выязджалі ў экспедыцыі.

Абодва былі актыўнымі членамі навуковых студэнцкіх гурткоў. З 1927 г. М. Грынблат быў адным з арганізатараў і старшынёй студэнцкага гуртка па вывучэнню Беларусі пры ЛДУ, пра што праінфармаваў беларускую грамадскасць праз часопіс “Наш край”, дзе ў 1926 г. у чацвёртым нумары ёсць невялічкая аб’ява пра гэты гурток [6, с. 95]. Менавіта з 1926 г. М. Грынблат становіцца сталым карэспандэнтам гэтага краязнаўчага часопіса. Ужо ў шостым нумары “Нашага краю” за гэты год ён заявіў аб планах падрыхтоўскі ўвосень 1926 г. спецыяльнага зборніка студэнцкіх прац па выніках летняй экспедыцыйнай дзейнасці членаў “Беларускага навукова-даследчага гуртка” Ленінградскага універсітэта [7, с. 77]. М. Пецюкевіч удзельнічаў у працы гуртку студэнтаў-этнолагаў Віленскага ўніверсітэта ім. С. Баторыя, выступаў на ім з паведамленнямі, некаторы час быў яго сакратаром, а ў той час, калі гуртком кіравала Марыя Знамяроўская-Пруферава, асістэнка прафесара Эрэнкройцавай, выконваў абавязкі скарбніка [8, с. 23].

М. Грынблат на рубяжы 1920–1930-х гг., яшчэ ў стдэнцкія гады, меў некалькі навуковых артыкулаў, прысвечаных этнаграфіі беларусаў. М. Пецюкевіч таксама надрукаваў шэраг артыкулаў пра культуру беларусаў.

**Акадэмічная кар’ера**. Абодва, нягледзячы на жыццёвыя абставіны, прысвяцілі ўсё сваё жыццё навуковай этнаграфічнай дзейнасці. М. Грынблат з размеркавання ў 1930 г. аж да выхаду на пенсію ў 1976 г. працаваў у Акадэміі навук БССР. М. Пецюкевіч да арышту, а таксама з моманту рэабілітацыі ў 1956 г. і да выхаду на пенсію ў 1970 г. працаваў у Торуньскім этнаграфічным музеі, а потым яшчэ доўгі час з ім супрацоўнічаў.

Можна з абсалютнай дакладнасцю канстатаваць, што абодва навукоўцы былі зацятымі палявымі этнографамі, кожны год выязджалі ў этнаграфічныя экспедыцыі, збіраючы ўнікальныя матэрыялы. М. Пецюкевіч яшчэ студэнтам распрацаваў шэраг апытальнікаў для вывучэння народных абрадаў пахавання і памінання, першы з якіх складаўся з 283 пытанняў, а другі – з 97 [9, с. 4]. І адзін і другі былі глыбокімі знаўцамі фактуры і ўсё жыццё змагаліся за яе дакладнасць. М. Грынблат, напрыклад, крытыкаваў у рэспубліканскай прэсе фальклорныя беларускія калектывы за недакладнасць іх касцюмаў і іх рэгіянальную неадпаведнасць [10, арк. 3]. М. Пецюкевіч прызнаваўся: “…Я хоць сёння магу напісаць артыкул, скажам, “Каса”. Пакажу, чым каса характэрная на Віцебшчыне, Гродзеншчыне, Беласточчыне. А не так, як пішуць вашы цяперашнія этнографы, – прылада касіць траву…” [11, с. 122].

Сумным падабенствам абодвух этнографаў была нерэалізаванасць навуковага патэнцыялу. Падчас Другой сусветнай вайны кожны вымушаны быў кінуць навуковую справу. Потым М. Пецюкевіч быў арыштаваны і высланы з Беларусі на доўгія гады, не мог займацца навукай, а пасля 1956 г. быў вымушаны рабіць кар’еру “з нуля” у Польшчы, у Торуньскім этнаграфічным музеі. У новых умовах ён быў вымушаны займацца вывучэннем не толькі беларусаў, але і палякаў. Шмат з задуманага было не рэа-

Polotsk SU

лізавана, шмат не скончана, як, напрыклад, праца пра этнаграфію роднай вёскі Цяцеркі. Гэта, дарэчы, цікавае падабенства з яшчэ адным прадстаўнікам гэтага пакалення – М. Улашчыкам, які таксама перажыў рэпрэсіі, аднавіў навуковую дзейнасць і напісаў этнагарфічны нарыс аб сваёй вёсцы. Па вялікаму рахунку і фармальная кар'ера не ўдалася – М. Пецюкевіч не здолеў абараніць кандыдацкую дысертацыю, так і застаўся магістрам этналогіі.

М. Грынблат, на наш погляд, таксама не рэалізаваў свій навуковы патэнцыял. У 1930-х гг. яго кар'ера ішла ўгору – з красавіка 1930 г. па студзень 1934 г. працаваў навуковым супрацоўнікам і быў вучоным сакратарам кафедры этнаграфіі Акадэміі навук БССР; з утварэннем Інстытута гісторыі ў АН БССР да чэрвеня 1937 г . – старэйшы навуковы супрацоўнік; з ліпеня 1937 г. па 24 чэрвеня 1941 г . – загадчык секцыі этнаграфіі і фальклора Інстытута гісторыі АН БССР. Адразу пасля вайны М. Грынблат абараніў кандыдатскую дысертацыю ў Маскве па спецтэме «Этнічны склад заходніх абласцей Беларусі», якую яму даручылі яшчэ на рубяжы 1942–1943 гг. праз Інстытут Этнаграфіі Акадэміі навук СССР ад Другога («выведвальнага») аддзела Генштаба Чырвонай Арміі [12, с. 44–46]. Аднак трэба памятаць, што гэта была ўжо другая дысертацыя, тэкст першай, па тэме «Фальклор грамадзянскай вайны», быў страчаны падчас вайны. Доктарскую, па вусных звестках калегаў, яму абараніць не далі. Пасля Другой сусветнай вайны яго фармальная кар'ера таксама не склалася, у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фалерыстыкі АН БССР ён працаваў старэйшым навуковым супрацоўнікам, высокіх пасад ужо не занімаў.

Не адзін ні другі не здолелі напісаць уласны opus magnum, хаця М. Грынблат быў бліжэй да гэтага. Колькасна М. Грынблат напісаў болей друкаваных работ, чым М. Пецюкевіч, аднак большасць з іх была звязана з вялікай рэдактарскай працай першага. Яны па-рознаму рэалізаваліся па часе: М. Грынблат быў фактычна "галоўным этнографам" БССР у 1930–1950-я гг., а М. Пецюкевіч стаў "галоўным беларусазнаўцай" Польшчы ў 1960–1970-я гг. Пры гэтым, з сумам трэба канстатаваць, што ні адзін ні другі не сталі шырока вядомымі ў этнаграфічнай навуке ў Беларусі: магістэрская праца М. Пецюкевіча аб стараверах Браслаўшчыны амаль невядомая нават вузкім спецыялістам, а фундаментальная праца М. Грынблата "Беларусы" лічыцца састарэлай.

У дачыненні да складанага пытання аб рэпрэсіях, можна зрабіць выснову аб рознасці герояў артыкула: М. Пецюкевіч быў арыштаваны і высланы з Беларусі на доўгі час, а М. Грынблат здолеў пазбегнуць рэпрэсій менавіта дзякуючы сваёй палітычнай добранадзейнасці. Ён быў тыповым прадстаўніком «этнаграфічнага маладняка», як трапна назваў студэнтаў-этнографаў другой паловы 1920-х гг. М. Маторын, лідар этнографаў-марксістаў, змагароў супраць «ідэалізму» рускай этнаграфіі старой школы [13, с. 8]. Гэты «ідэалізм» уяўляў сабой «любаванне старынай, захапленне нацыянальна-шавіністычнымі ідэаламі…» [13, с. 8]. У фондах Інстытута гітсторыі АН БССР захавалася справа без назвы і подпісаў ад 1936 г., у пачатку справы толькі пазначана «Інстытут гісторыі». У ёй дадзены характарыстыкі (у тым ліку палітычныя) усім супрацоўнікам Інстытута гісторыі. Ёсць там словы і аб М. Грынблаце: «З'яўляецца каштоўным і сур'ёзным навуковым работнікам у галіне этнаграфіі. Ім закончана складанне зборніка па савецкаму фальклору. У сучасны момант працуе над тэмай "Нарысы гісторыі беларускага фальклора. У грамадска-культурным жыцці ён праяўляе вялікую актыўнасць. У сэнсе палітычнай благанадзейнасці т. Грынблат не выклікае сумнення» [14, арк. 7]. Аб палітычным даверы М. Грынблату сведчыць уся яго даваенная кар'ера. Тым не менш, глабальна М. Грынблат не здолеў пазбегнуць рэпрэсій, абвінавачванняў у касмапалітызме і непрацяглага звальнення з Акадэміі навук, якое ўдалосяануляваць дзякуючы падтрымцы М. Нікольскага.

Для гэтага пакалення паказальны прыклад іншай яго прадстаўніцы ў галіне этнаграфіі – вучаніцы У. Багараза і гістарычнага партыкулярыста Франца Боаса – Юліі Аверкіевай, якая адбыла заключэнне ў лагеры, але здолела вярнуцца ў прафесію, аднавіць і зрабіць акадэмічную кар'еру. Аднак праз такія цяжкія выпрабаванні гэтае пакаленне атрымала пачуцце страху і моцную самацэнзуру…

Апошняе на чым хочацца засяродзіць увагу – гэта светапогляды герояў артыкула. М. Грынблат быў хутчэй атэістам. Не захавалася дадзеных пра яго рэлігійнасць, аднак яўрэйскія карані, адукаванасць сям'і і жыццё у савецкай краіне не маглі не даць свае вынікі. У адрозненні ад яго, М. Пецюкевіч быў чалавекам рэлігійным, заставаўся "прыстойным" каталікам, а ў апошнія гады жыцця звяртаўся да рэлігіі часцей.

Такім чынам, можна з упэўненасцю канстатаваць, што М. Грынблат і М. Пецюкевіч належаць да аднаго пакалення беларусаў, якія перажылі аднолькавыя вырашальныя для нашай краіны гістарычныя падзеі, што не магло аказаць уплыў на іх светапогляд. Зразумела, што кожны з іх меў непадобныя асабістыя рысы характару, звычкі і ўяўленні. Аднак агульныя сацыяльныя рысы мелі вырашальнае значэнне як для іх асабістага жыццёвага лёсу, так і для гісторыі беларускай этнаграфіі.

Буйны сучасны знаўца сацыяльна-культурнай антрапалогіі Томас Эрыксан звярнуў увагу на поспех у гэтай навуцы маргінальных асобаў і ўвогуле на феномен маргінальнасці. Лідэры буйных школ былі эмігрантамі, аўцайдэрамі [15]. З гэтага ракурсу і М. Грынбылт і М. Пецюкевіч былі класічнымі



PolotskSU

маргіналамі. Першы быў выхадцам з яўрэйскай сям'і, які ўдзельнічаў у беларускім тэатральным руху, імкнуўся стаць беларусам, але неаднаразова цярпеў з-за гэтага. Прыкладам з'яўляецца выгнанне яго з Акадэміі навук за касмапалітызм. Глабальна гэта можна сфармуляваць так: Маісей Грынблат – яўрэй, які займаўся беларускім фальклорам і этнаграфіей. М. Пецюкевіч быў беларусам, які быў "неблаганадзейным" у II Рэчы Паспалітай за актыўную ролю ў беларускім нацыянальным руху. Для кар'еры павінен быў хаваць сваю "беларускасць", а пасля рэабілітацыі вымушаны працаваць у Польшчы [16, с. 109–110].

Абодва сталі ахвярамі рэпрэсій, але па-рознаму. М. Пецюкевіч быў арыштаваны і сасланы. М. Грынблат падтрымаў ганенні на "нацдэмаў", лічыўся благанадзейным, але напрыканцы 1940-х гг. папаў пад падазрэнне як сіяніст. І для аднаго і для другога гэта стала пераломнай кропкай у кар'еры. М. Пецюкевіч пасля вызвалення ў 1956 г. вымушаны быў з'ехаць у Польшчу. М. Грынблат у другой палове 1940-х гг. страціў кіруючыя пасады ў этнаграфічнай навуцы ў БССР і больш іх не занімаў.

Абодва шмат напісалі, але з большага не тое, што хацелі. У Польшчы Пецюкевіч вымушаны быў займацца хутчэй не беларусамі, а Грынблата цікавілі межэтнічныя і нацыянальныя працэсы, але гэтая тэма была пад забаронай ці моцна цэнзураваная.

У пэўным сэнсе гэтыя жыццёвыя акалічнасці можна экстрапаляваць на іншых прадстаўнікоў гэтага пакалення і яны з большага супадуць.

ЛІТАРАТУРА

1. Howe, N. Generations: The History of America's Future, 1584 to 2069 / N. Howe, W. Strauss. – 1991. – New York : William Morrow & Company. – Рэжым доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%A2%D0%B5%D0%BE%D1%80%D0%B8%D1%8F_%D0%BF%D0%BE%D0%BA%D0%BE%D0%BB%D0%B5%D0%BD%D0%B8%D0%B9. – Дата доступа: 12.04.2016.
2. Шанин, Т. История поколений и поколенческая история России / Т. Шанин // Человек. Сообщество. Управление. – 2005. – № 3. – С. 6–25.
3. Чумаков, В. Теория поколений / В. Чумаков. – Рэжым доступа: http://svblog.ru/teoriya-pokoleniy/. – Дата доступа: 12.04.2016.
4. Луцкевіч, Л. Марыян Пецюкевіч / Л. Луцкевіч, Г. Войцік. – Вільня : Рунь, 2001. – 20 с.
5. Грынблят, М. Этнаграфічнае вывучэнне каўтуна / М. Грынблят // Запіскі Аддзела гуманітарных навук. – Кн. 4. Працы кафедры этнаграфіі. Т. 1. Сш. 1. – 1928. – С. 127–153.
6. Пецюкевіч, М. Уклад Казіміра Машынскага ў даследаванні народнай культуры беларусаў / М. Пецюкевіч // Сляды незабыўныя продкаў : этнаграфічныя нарысы. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – С. 112–119.
7. Грынблят, М.Я. Некаторыя матар'ялы да вывучэньня пастушаства і жывёлагадоўлі Тураўшчыны / М.Я. Грынблят // Наш край. – 1928. – № 8–9. – С. 64–71.
8. Muzalewska-Alexandrowicz, H. Marian Pieciukewicz – życie i działalność / H. Muzalewska-Alexandrowicz, R. Tubaja // Materiały Muzeum Etnograficznego w Toruniu. – № 1. – С. 21–28.
9. Салавей, Л. Адданы Беларусі / Л. Салавей // Сляды незабыўныя продкаў : этнаграфічныя нарысы / М. Пецюкевіч. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – С. 3–6.
10. Грынблат, М.Я. Пра какошнікі і камізэлькі з фалдамі / М.Я. Грынблат // Літаратура і мастацтва. – Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Ф. 393. Воп. 1. Спр. 132. Арк. 3.
11. Саламевіч, Я. Этнаграфія – яго любоў / Я. Саламевіч // Сляды незабыўныя продкаў: этнаграфічныя нарысы / М. Пецюкевіч. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – С. 120–122.
12. Алымов, С.П. И. Кушнер и развитие советской этнографии в 1920–1950-е годы / С.П. Алымов. – М. : ИЭА, 2006. – 278 с.
13. Маторин, Н.М. 15 лет советской этнографии / Н.М. Маторин // Советская этнография. – 1932. – № 5–6. – С. 3–14.
14. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 32.
15. Eriksen, T.H. A History of Anthropology / T.H. Eriksen, F.S. Nielsen – London : Pluto Press, 2001. – С. 53–54.
16. Пецюкевіч, М. У пошуках зачараваных скарбаў / М. Пецюкевіч. – Вільня : Рунь, 1998. – 182 с.

## THE INTER-WAR GENERATION OF BELARUSIAN ETHNOGRAPHER: M. GREENBLATT VS M. PETSYUKEVICH

***S. ZAHARKEVICH***

*The paper presents an attempt to carry out an overall analysis of the interwar generation of ethnographers Belarus by comparing biographies M.Petsyukevich and M.Grinblat. They were contemporaries of the major historical events of the twentieth century, with connected with Belarus, which had an impact on the formation they have a similar view of the world. Both were passionate about the study of the culture of the Belarusian people. Neither of them managed to reach its full scientific potential in the end.*



PolotskSU